УДК 39-053.2

# Перасяленне беларусаў у Калінінградскую вобласць ў 1946-1953 гг.

Якубінская А. Дз.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Беларуская дыяспара Калінінградскай вобласці сфарміравалася ў выніку міграцыйных працэсаў, якія пачаліся з сярэдзіны XX ст. У 1946г. была ўтворана Кёнігсбергская вобласць, пазней пераіменаваная ў Калініградскую. У дачыненні да рэгіёна праводзілася прымусовая кампенсацыйная міграцыя, гэта значыць карэнных жыхароў вобласці замянялі перасяленцамі. Прычына правядзення перасяленчай палітыкі – гэта неабходнасць ў папаўненні вобласці працоўнымі рэсурсамі і аднаўленні яе народнай гаспадаркі. Перасяленне праводзілася ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 9 ліпеня 1946г. №1522 "Аб добраахвотным перасяленні ў Калінінградскую вобласць сем'яў калгаснікаў". І хаця палітыка сельскагаспадарчага перасялення праводзілася на добраахвотнай аснове спецыяльнымі аддзеламі па перасяленні, але органы унутраных спраў афармлялі сакрэтную дакументацыю і прапаганда перасялення праводзілася ў асноўным у дачыненні да беларусаў цэнтральных і ўсходніх абласцей БССР. За перыяд з 1946г. да 1953г. з БССР у Калінінградскую вобласць перасялілася 54500 беларусаў, у большасці яны паходзілі з Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. Таксама невялікая частка беларусаў перасялілася з Варонежскай, Калужскай, Смаленскай і Бранскай абласцей РСФСР. Перасяленцы з Беларусі ў асноўным рассяляліся ў трох раёнах вобласці: у Праўдзінскім раёне яны складалі 58%, у Гвардзейскім раёне – 45%, у Чарняхоўскім раёне – 10% ад астатніх перасяленцаў раёнаў. Міграцыя беларусаў ў Калінінградскую вобласць ў першыя пасляваенныя гады ўяўляе сабой складаны працэс тэрытарыяльнага перамяшчэння народа, які мае палітычную, эканамічную, сацыяльную, культурную афарбоўку. Усе беларускія перасяленцы з'яўляліся носьбітамі розных рэгіянальных культурных і моўных традыцый. Аднак ва ўмовах першых пасляваенных гадоў яны не здолелі захаваць моўныя асаблівасці, паступова страцілі ідэнтыфікацыю з мовай свайго народа на карысць рускай мовы, як мовы сацыяльных кантактаў, што, у сваю чаргу, стала прычынай асіміляцыі беларусаў Калінінградскай вобласці. Дадатковымі прычынамі з'яўляюцца савецкая палітыка русіфікацыі, працэсы індустрыялізацыі і урбанізацыі Калінінградскай вобласці. Акрамя таго часта заключаліся міжэтнічныя шлюбы, пераважна з рускімі і ўкраінцамі, фарміраваліся нацыянальна-змешаныя сем'і.